УДК 378.147:811.161.3

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ТЭСТАВЫХ ЗАДАННЯЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА. ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА”

Г. В. САГІЕВА, А. В. ШАРАПАВА
Дзяржаўная ўстанова вышэйшай прафесійнай дукацыі
«БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ»
Магілеў, Беларусь

Найважнейшай задачай педагагічнага працэсу з'яўляецца забеспячэнне дастаткова надзейнай і эфектыўнай методыкі кантролю за якасцю засваення вучэбнага матэрыялу студэнтамі. Разам з традыцыйнымі прыёмамі (франтальнае апытванне, творчыя заданні, самастойныя і кантрольныя работы) дадатковым сродкам падобнага кантролю могуць быць і тэсты, г. зн. стандартызаваныя, як правіла, абмежаваныя ў часе выпрабаванні на вызначэнне ўзроўню акадэмічнай кампетэнцыі будучых спецыялістаў. Бясспрэчнай перавагай тэст-методыкі з'яўляецца яе аператыўнасць, якая дазваляе выкладчыку своечасова ўносіць адпаведныя карэктывы ў змест педагагічнага працэсу. Тэсты патрабуюць не толькі канкрэтных ведаў, але і ўменне абагульняць і аналізаваць матэрыял, яны стымулююць лагічнае мысленне, садзейнічаюць развіццю інтэлектуальных здольнасцяў студэнтаў, павышэнню іх цікавасці да прадмета, і таму з'яўляюцца важным этапам набыцця акадэмічных кампетэнцый.

Па сваім змесце тэставыя заданні павінны адпавядаць патрабаванням адукацыйных стандартаў па пэўных спецыяльнасцях. Неабходна адзначыць, што тэсты рэкамендуецца складаць у адпаведнасці з пяццю асноўнымі ўзроўнямі засваення вучэбнага матэрыялу: пазнаванне раней вывучанага пры паўторным успрыманні, узнаўленне па памяці, узнаўленне на ўзроўні разумення, прымяненне ведаў у знаёмай сітуацыі, прымяненне ведаў у незнаёмай сітуацыі.

У якасці прыкладу прывядзем магчымыя варыянты тэстаў пры вывучэнні уступных тэм дысцыпліны (1. Мова і соцыум. 2. Беларуская мова і яе месца ў моўнай супольнасці свету. 3. Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы), бо іншыя тэмы, звязаныя з лексічнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі асаблівасцямі беларускай мовы, належным чынам распрацаваныя ў кантэксце сістэмы цэнтралізаванага тэсціравання.

1.1. З прыведзеных тэорый вызначце тую, якая не звязана з паходжаннем мовы: а) логасная (рэлігійная), б) “грамадскай дамоўленасці”, в) этымалагічная (натуралістычная), **г) эстэтычная**; 1.2. Назавіце дзве асноўныя функцыі мовы: а) фатычная і акумуляцыйная, б) намінацыйная і эмацыйная, **в) камунікацыйная і пазнавальная**, г) эстэтычная; 1.3. Устанавіце сэнсавую адпаведнасць паміж назвай функцыі мовы і яе характарыстыкай, выберыце правільную паслядоўнасць літар і лічбаў: А) эстэтычная, Б) камунікацыйная, В) намінацыйная, Г) акумуляцыйная − 1)

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета

дапамагае называць прадметы, з’явы рэчаіснасці і інш., 2) дапамагае людзям мець зносіны паміж сабой і перадаваць патрэбную інфармацыю, 3) дапамагае уздзейнічаць на пачуцці і думкі чалавека не толькі зместам, але і формай выказвання, 4) дапамагае людзям захоўваць традыцыі, культуру, нацыянальную самасвядомасць: а) А 1, Б 2, В 3, Г 4, **б) А 3, Б 2, В 1, Г 4**, в) А 2, Б 4, В 3, Г 1, г) А 4, Б 3, В 2, Г 1.

2.1. Беларуская мова адносіцца да а) паўночнай падгрупы германскай групы індаеўрапейскай моўнай сям’і, б) балтыйскай групы індаеўрапейскай моўнай сям’і, **в) усходняй падгрупы славянскай групы індаеўрапейскай моўнай сям’і**, г) раманскай групы індаеўрапейскай моўнай сям’і; 2.2. Стараславянская мова − гэта **а) першая пісьмовая мова ўсходніх славян**, б) мова, якая лягла ў аснову сучаснай беларускай літаратурнай мовы, в) адзіная вусная мова старажытных усходніх славян, г) адзіная мова ўсіх славян.

3.1. Лінгва-стылістычны аналіз славутага твора “Слова пра паход Ігаравы” (XII ст.) вылучае версію, што яго аўтар а) Еўфрасіння Полацкая, **б) Кірыла Тураўскі**, в) Францыск Скарына, г) Мікола Гусоўскі; 3.2. Старабеларуская мова набыла статус дзяржаўнай у а) Полацкім княстве, **б) Вялікім Княстве Літоўскім**, в) Рэчы Паспалітай, г) Рэспубліцы Беларусь; 3.3. Устанавіце сэнсавую адпаведнасць паміж выдатным дзеячам і яго творам, выберыце правільную паслядоўнасць літар і лічбаў: А) Ф. Скарына, Б) С. Полацкі, В) М. Сматрыцкі, Г) С. Сабаль − 1) “Рыфмалагіён”, 2) “Граматыка”, 3) “Апостал”, 4) “Буквар”: а) А 2, Б 4, В 3, Г 1, б) А 1, Б 2, В 3, Г 4, **в) А 3, Б 1, В 2, Г 4**, г) А 3, Б 4, В 2, Г 1; 3.3. Новая беларуская літаратурная мова пачынае сваё адраджэнне ў XIX ст. на аснове а) старажытнай літаратуры, **б) народных гаворак**, в) рускай і польскай моў; г) рускай і ўкраінскай моў; 3.4. У 1918 г. падрыхтавана “Беларуская граматыка для школ”, аўтарам якой з’яўляецца а) Я. Карскі, **б) Б. Тарашкевіч**, в) М. Гарэцкі, г) В. Ластоўскі; 3.5. У адпаведнасці з Законам “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь” беларуская мова набыла статус дзяржаўнай у а) 1938 годзе, б) 1956 годзе, в) 1985 годзе, **г) 1990 годзе**.

Такога роду тэсты дазваляюць студэнтам і выкладчыкам праверыць і прааналізаваць веды па дысцыпліне “Беларуская мова. Прафесійная лексіка”. Заданні носяць таксама і навучальны характар, бо работа з тэстамі дае магчымасць звярнуць увагу на многія канкрэтныя аспекты і немалаважныя дэталі, якія пры простым чытанні падручніка могуць застацца па-за межамі ўвагі. Такім чынам, неабходна адзначыць прадуктыўнасць тэставых форм работы ў кантэксце названай дысцыпліны.

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета